**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за чэрвень 2017 г.

У чэрвені ў публічных бібліятэках ДУК стартаваў раённы конкурс летняга чытання “Летом с книгой я дружу”. У рамках конкурсу бібліятэкі праводзяць мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў.

## Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу летняга чытання “Летом с книгой я дружу”

***1 чэрвеня***

На свята дзяцінства “Мир детства - самый лучший мир” у госці да дзяцей прыйшлі героі розных казак і клоуны. Самы актыўны ўдзел дзеці прынялі ў віктарынах, гульнях, конкурсе малюнка на асфальце, пазнаёміліся з планам працы бібліятэкі на лета. Лепшыя чытачы бібліятэкі і самыя актыўныя ўдзельнікі свята атрымалі падарункі і салодкія прызы. Увазе юных карыстальнікаў падрыхтавана кніжная выстава “Читаем летом” і выстава малюнкаў “Краски лета”.

Батчынская ПБ, 95 чал.

***2 чэрвеня***

На свяце чытаючага дзяцінства “Читайте, дерзайте, свой мир открывайте!” увазе дзяцей была прадстаўлена забаўляльная гульнявая праграма з героямі любімых кніг: Бурацінам, Катом Базіліа і Лісой Алісай. Дапоўнілі праграму гумарыстычнае прадстаўленне "Поиграй-ка, угадай-ка!"; знаёмства з кніжнымі навінкамі і пазнавальнае вандраванне ў "Книжкину гостиную". Тэматычная віктарына, конкурсы і рухавыя гульні дазволілі дзецям не толькі цікава правесці час, але і пашырыць свае веды па правілах дарожнага руху.

Дзівінскі філіял, 76 чал.

***7 чэрвеня***

Сусветны дзень аховы навакольнага асяроддзя ў бібліятэцы адзначылі пазнавальнай гадзінай “Земля - наш общий дом”. Дзеці прымалі ўдзел у гульні “Кто я такой?”, пазналі пра экалагічныя праблемы сучаснасці. “Экологический практикум” дапамог прысутным вызначыць, наколькі малы адсотак даступнай для выкарыстання прэснай вады і карыснай сушы ад агульнай плошчы зямной паверхні. З дапамогай віктарыны “По страницам Красной книги” пазнаёміліся з рэдкімі і знікаючымі відамі раслін і жывёл.

Дзівінскі філіял, 59 чал.

***8 чэрвеня***

Тэматычны ўрок “Защитим природу вместе” быў накіраваны на выхаванне ў дзяцей беражлівага дачынення да прыроды. Дзеці адказвалі на пытанні віктарыны “Мы - друзья природы!”, разгадвалі загадкі, бралі ўдзел у конкурсе малюнкаў. Увазе юных карыстальнікаў падрыхтавана кніжная выстава “Береги свою планету” і відэапрэзентацыя “Природа и экология”. У час акцыі “Украсим родной уголок” дзеці садзілі кветкі і збіралі смецце.

Батчынская ПБ, 45 чал.

***9 чэрвеня***

Маленькія карыстальнікі бібліятэкі адправіліся ў займальнае кніжнае падарожжа ў "Краіну ветлівасці і дабрыні". Дзеці пазнаёміліся і пасябравалі з самымі ветлівымі і выхаванымі героямі кніг - Мэры Попінс і катом Леапольдам, з задавальненнем прынялі ўдзел у філалагічнай гульні "Перепутанные буквы", пазналі, як вітаюць адзін аднаго жыхары розных краін і на развітанне паглядзелі добры мультфільм.

Дзівінскі філіял, 88 чал.

***10 чэрвеня***

На адгадай-шоу “Сказочная эстафета солнечного лета” юныя чытачы прымалі ўдзел у казачных эстафетах з героямі любімых кніг “Красная шапочка”, “Доктор Айболит”, “Пирожок”, “Алиса и кот Базилио”. Спаборнічалі ў конкурсах “Незнайка на воздушном шаре”, “Ядро барона Мюнгхаузена”, “Кот в сапогах”. Дзеці знаёміліся з кніжнымі навінкамі “По страницам сказок”, разгадвалі загадкі па беларускіх народных казках.

Гарадзецкі філіял, 42 чал.

***14 чэрвеня***

У Краіне прававых ведаў на шоу "Знай. Соблюдай. Выполняй" дзеці пазнаёміліся з асновамі заканадаўства Беларусі, з Канвенцыяй па правах дзіцяці. Для літаратурных герояў адкрылася юрыдычная кансультацыя, куды кожны з іх мог звярнуцца са сваёй скаргай ці просьбай пра абарону. Інсцэніроўка "Ох, уж этот Петенька!" прадэманстравала дзецям, што правы падаюцца толькі таму, хто выконвае свае абавязкі.

Дзівінскі філіял, 58 чал.

***17 чэрвеня***

Удзельнікі ўрока бяспекі “101 спешит на помощь” пазналі пра карысныя і небяспечныя ўласцівасці агню, адказалі на пытанні віктарыны “Огонь в нашей жизни”, паўдзельнічалі ў гульні “Да и нет” і паглядзелі слайд–шоу пра пажарную бяспеку “Помни каждый гражданин!”. На прыканцы дзеці наведалі ПАСП №11 Кобрынскага РАНС аг. Батчы, дзе для іх была праведзена аглядная экскурсія па тэрыторыі пажарнай часці.

Батчынская ПБ, 35 чал.

***18 чэрвеня***

Удзельнікі пазнавальнай гульні "Молочная страна" пазналі пра важны прадукт харчавання – малако і яго ўплыў на здароўе чалавека. Дзеці адгадвалі загадкі пра малочныя прадукты, прымалі ўдзел ў гульнях "Съешь йогурт", "Пальчиковая гимнастика", "Кто быстрее выпьет молоко", вывучылі

танец "33 коровы", праслухалі інфармацыйны агляд "О молоке от А до Я". Пад канец мерапрыемства ўсім прысутным ўручылі салодкія прызы.

Гарадзецкі філіял, 33 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

***2 чэрвеня***

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры адбыўся Дзень прафесійных зносін “Библиотечный сайт как площадка коллективной творческой работы: ресурсы и возможности”, у якім прынялі ўдзел супрацоўнікі публічных бібліятэк раёна. Адбылася дзелавая размова пра ўдзел кожнай бібліятэкі ў развіцці сайта. Спецыяліст аддзела бібліятэчнага маркетынгу прадставіла выданыя метадычныя матэрыялы ў дапамогу працы бібліятэк, пададзеныя на бібліятэчным сайце.

ЦРБ, 42 чал.

***4 чэрвеня***

Свята духоўнай кнігі “На Троіцын дзень” сабрала жыхароў аграгарадка. Вядучыя расказалі пра гісторыю, абрады і звычаі свята. Са словамі віншавання да прысутных звярнуўся настаяцель храма Ўшэсця Гасподня аг. Гарадзец Георгій Чэрвякоўскі. Удзельнікі мерапрыемства ўспаміналі традыцыі, прыказкі і прымаўкі, звязаныя з Сёмухай, чыталі вершы пра свята, сплялі вяночкі і завязалі стужачкі на бярозе, загадаўшы жаданне. Бібліятэкары правялі традыцыйныя для Сёмухі гульні і пачаставалі ўсіх прысутных гарбатай з лекавых раслін.

Гарадзецкі філіял, 63 чал.

***5 чэрвеня***

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры адбылася чарговая гульня “Что? Где? Когда?”, у якой бралі ўдзел каманды гульцоў “залатога веку”. Тэмы гульні – “Назад в СССР”, “Православие”. У змаганні перамагла каманда “Старики-разбойники”. Пераможцаў павіншавалі дырэктар Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Страчук А. С. і старшыня Кобрынскай раённай арганізацыі “Белая Русь”, галоўны рэдактар газеты “Кобрынскі веснік” Мельнік Р. У. Мерапрыемства суправаджалася музычнымі нумарамі.

ЦРБ, 46 чал.

***8 чэрвеня***

Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання у бібліятэцы адбылося свята беларускай кнігі “Імя славутае ў вяках. Францыск Скарына: ушанаванне памяці!”. У ходзе мерапрыемства адбылося відэа-падарожжа па старонках жыцця і творчасці беларускага першадрукара Францыска Скарыны. Прадстаўлена прэзентацыя кніжнай выставы “Духоўная спадчына Скарыны”.

Хідрынская ПБ, 56 чал.

***8 чэрвеня***

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры адбылося пасяджэнне аматарскага клуба “Золотые годы” “Секреты здорового питания”. У сустрэчы прынялі

ўдзел памочнік урача-гігіеніста Кобрынскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Яшчук В. А., урач-інтэрн ЦРБ Пальчук Е. Ю. і урач-валеолаг, дыетолаг Васільева С.С., якія распавялі прысутным пра асноўныя прынцыпы і медыцынскія асновы правільнага харчавання, пра тонкасці збалансаванай дыеты. Член народнага аматарскага аб'яднання “Белый аист” Літошык У. І. прачытала вершы пра здаровы лад жыцця.

ЦРБ, 38 чал.

***18 чэрвеня***

У рамках Года навукі прайшоў турнір інтэлектуалаў "О, сколько нам открытий чудных готовит просвещенья дух". Дзецям прапанавалі разгадаць рэбус і адказаць на пытанні бліц-турніру. Каманды спаборнічалі адзін з адным у конкурсах "Па старонкам беларускай літаратуры", "Литературные омонимы", "Народная мудрость", "Сказка ложь, да в ней намёк", "Литературные анаграммы" і "Угадай то - не знаю, что". У якасці ўзнагароды дзеці атрымалі магчымасць скарыстацца дадатковымі паслугамі бібліятэкі бясплатна.

Дзівінскі філіял, 48 чал.

***22 чэрвеня***

У абеліска воінам-вызваліцелям у цэнтры Дзівіна пачалася патрыятычная акцыя “Чтобы помнили...”. Дзеці чыталі ўрыўкі дакументальных звестак з кнігі "Памяць", падзяліліся ўспамінамі сваіх дзядоў і прадзедаў пра падзеі пачатку вайны. Мерапрыемства працягнулася праграмай “Вечная память в строчках написанных”, дзе бібліятэкары прадставілі кніжную выставу-рэкамендацыю "Прачытай кнігу пра вайну", слайд-шоу пра ветэранаў Дзівіна, правялі конкурс вершаў пра вайну. Завяршылася праграма канцэртам дзіцячай вакальнай групы.

Дзівінскі філіял, 122 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81